РЫНАК ПРАЦЫ

# Змяніць месца жыхарства дзеля месца работы

## Кожнаму беспрацоўнаму Падзвіння — пяць вакансій

**Паводле слоў намесніка старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, кіраўніка Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандра ХРЫСТАФОРАВА, сёння ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя ў Падзвінні — прыкладна 0,3 %. І ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ён не змяніўся. На ўліку ў якасці беспрацоўных знаходзіцца менш за 1,5 тысячы чалавек.**




У той жа час наймальнікамі заяўлены звесткі аб больш чым 7,7 тысячы свабодных працоўных месцаў, што на 27,4 % больш, чым у мінулым годзе. Такім чынам, на аднаго беспрацоўнага прыпадае пяць вакансій.

> Усё больш людзей цікавіцца магчымасцю атрымаць садзейнічанне ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму. Усё больш у трэндзе быць рамеснікам.

Субсідыя даецца ў памеры адзінаццаці разавых велічынь бюджэту пражытковага мінімуму. На сёння гэта тры тысячы рублёў. А ў малых гарадах і раёнах з высокай напружанасцю на рынку працы, а таксама ў сельскіх населеных пунктах — у памеры пятнаццаці разавых велічынь (4,1 тысячы рублёў). І яшчэ больш пры арганізацыі беспрацоўнымі бізнесу, звязанага з укараненнем вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак. Дарэчы, сёлета субсідыі атрымалі больш за сорак чалавек.

У беспрацоўных ёсць магчымасць пры фінансавай падтрымцы дзяржавы змяніць месца жыхарства. Пераезд і працаўладкаванне ажыццяўляюцца ва ўзгодненыя з наймальнікам тэрміны, прадугледжаныя ў дамове. Пры гэтым беспрацоўным робіцца выплата грошай (упраўленнем па працы ва месцы знаходжання наймальніка) у памеры сямiразовай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму. Дадаткова — выплата ў памеры двухразовай велічыні бюджэту пражытковага мінімуму пры перасяленні з гарадоў на новае месца жыхарства і работы ў малыя, сярэднія гарадскія паселішчы, у сельскую мясцовасць, а таксама гарады-спадарожнікі.

Як падкрэсліў Аляксандр Хрыстафораў, такім чынам, пачынаючы з 1990-х гадоў, змянілі месца жыхарства дзеля новай работы каля 2,3 тысячы сямей, у тым ліку сёлета — дзесяць.

Наколькі пандэмія паўплывала на ўсё, што звязана з рынкам працы?

У Віцебскай вобласці, якая мяжуе з Расіяй, яна паспрыяла вяртанню дадому многіх з тых, хто працаваў у суседняй краіне. Ды і наогул прайшоў час, калі было папулярна ездзіць «па рубель» у Маскву, Падмаскоўе і гэтак далей. Усё больш беларусаў разумеюць, што не такі ён ужо і «доўгі», гэты рубель, што нярэдка не абыходзіцца без падману. На радзіме ж, як мовяць, і сцены дапамагаюць.

COVID-19 таксама стаў прычынай больш актыўнага выкарыстання інфармацыйных тэхналогій пры пошуку месцаў работы. А ў Прыдзвінні, дарэчы, першымі пачалі праводзіць электронныя кірмашы вакансій. Каб больш эфектыўна дапамагаць людзям з абмежаванымі магчымасцямі знайсці сабе прымяненне, з пазамінулага года ўкаранілі практыку іх суправаджэння падчас працаўладкавання: з пачатку пошуку да сумеснага візіту да працадаўцы.

А якая сітуацыя ў віцебскай глыбінцы?

І там яна стабільная, канстатуюць эксперты. Пры гэтым прыдумваюць новыя падыходы. У прыватнасці, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Чашніцкага райвыканкама Людміла Галавешка расказала пра вопыт сталунказ з жыхарамі Новалукомля. Ім больш не трэба прыязджаць па пытаннях пошуку працы ў райцэнтр, бо па аўторках арганізаваны выязны прыём. Штоквартальна арганізоўваюць тэматычныя прамыя лініі. У сярэднім у раёне шукаюць работу менш за 2,5 месяца. Каб задаволіць інтарэс, актыўна выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці. У прыватнасці, рэсурсы раённай газеты, дзе ёсць інфармацыя аб вакансіях.

Начальнік аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Аршанскага раённага выканаўчага камітэта Марына Ляхава канстатуе, што ў грамадзян ёсць магчымасць атрымаць новую прафесію, пакуль яшчэ не звольнілі па скарачэнні штатаў. Вельмі шчыльна ў гэтым кірунку вядзецца супрацоўніцтва з ільнокамбінатам. Напрыклад, больш не запатрабаваныя на прадпрыемстве ткачы могуць стаць аператарам ільночасальнай машыны і кантралёрам якасці. Служба занятасці аплачвае выдаткі на перанавучанне. І гэта вельмі выгадна працадаўцам.

Асаблівая тэма — дапамагчы знайсці работу тым, хто адбываў пакаранне. У раёне дзве ўстановы папраўчай сістэмы. І зноў жа біржа працы фінансава падтрымлівае правядзенне майстар-класаў , каб на волі чалавек змог самастойна зарабляць. Такім чынам, толькі летась каля дваццаці пяці грамадзян атрымалі прафесіі, якія вельмі цэняцца: слесара, токара, маляра, станочніка дрэваапрацоўчых станкоў, рэзчыка па дрэве, фрэзероўшчыка, заточніка.

Сёння для ўсіх беспрацоўных вядзецца навучанне па трыццаці пяці прафесіям. Акрамя пералічаных вышэй, можна набыць прафесіі сантэхніка, цырульніка, кухара, кандытара, слесара па рамонце аўто, вадзіцеля пагрузчыка, майстра па манікюры і гэтак далей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МІНІ-ПАЛІГОНЫ — НА КАНТРОЛІ ЎЛАД І ЭКОЛАГАЎ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 7-й стар.)*

Адзін з такіх шматфункцыянальных комплексаў да 2023 года пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю і на тэрыторыі Гомельскага раёна. Сучасны аб'ект не толькі паспрыяе забеспячэнню належнага санітарнага стану тэрыторыі абласнога цэнтра і Гомельскага раёна, але і вырашыць экалагічныя праблемы: эпідэміялагічную ахову людзей, ахову глебы і вады ад забруджвання — для Чачэрскага, Веткаўскага, Добрушскага, Рэчыцкага і Лоеўскага раёнаў. Глыбіня перапрацоўкі адходаў на новым шматфункцыянальным комплексе складзе каля 70 %.

> Але пакуль закрыццё пляцовак для часовага ўтрымання адходаў выклікае пэўную напружанасць, стала складана забяспечваць санітарны парадак, адзначаюць у сельсаветах.

Між тым у Гомельскім раёне працягваецца планамерная работа па закрыцці пляцовак для часовага складзіравання адходаў. У адпаведнасці з вышэйадзначанай нацыянальнай стратэгіяй неабходна ліквідаваць у рэгіёнах усе міні-палігоны да 2022 года, а звалены ўзямлю далучыць да сельгасабароту або перадаць у лясны фонд. Але пакуль закрыццё пляцовак для часовага ўтрымання адходаў выклікае пэўную напружанасць, стала складана забяспечваць санітарны парадак, адзначаюць у сельсаветах.

На тэрыторыі Шарпілаўскага сельсавета няма ніводнага міні-палігона (апошні закрылі летась), таму вываз цвёрдых камунальных адходаў — адна з актуальных праблем. Па словах **старшыні сельвыканкама Дзмітрыя ЯРШОВА**, сітуацыя пагаршаецца тым, што на тэрыторыі сельсавета шмат дамоў сезоннага пражывання: у Шарпілаўцы лецішчаў — 40 %, у Новых Дзятлавічах — каля 70 %.

— Мы пастаянна праводзім тлумачальную работу з вяскоўцамі, расказваем пра карысць цэнтралізаванага вывазу цвёрдых камунальных адходаў, таму многія жыхары сельсавета і нават некаторыя дачнікі заключылі дагаворы з Гомельскім райжылкамгасам, — адзначае Дзмітрый Яршоў. — Аднак сёння камунальная служба прапануе аплачваць гэтую паслугу на працягу ўсяго года, што нявыгадна для тых, хто пражывае тут усяго некалькі месяцаў.

Калі на тэрыторыі сельсавета дзейнічалі два міні-палігоны, людзі вывозілі туды адходы, хай і без аплаты, але ўсё-ткі везлі да месца іх размяшчэння. Цяпер жа ўсё часцей можна ўбачыць адходы, у тым ліку старую бытавую тэхніку, на кантэйнерных пляцоўках паблізу грамадзянскіх могілак. Вядома, несанкцыянаваны вываз адходаў пагражае штрафам.

— Лічу, што з улікам сітуацыі, якая склалася, закрываць міні-палігоны неабходна толькі пасля ўводу ў эксплуатацыю комплексу па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі, — дзеліцца старшыня сельвыканкама.

Сёння, улічваючы запланаваныя тэрміны ўводу гэтага комплексу, Гомельскі райвыканкам разглядае пытанне аб працягу эксплуатацыі пяці міні-палігонаў да завяршэння будаўніцтва названага аб'екта.

— На дадзены момант на тэрыторыі Гомельскага раёна дзейнічаюць сем міні-палігонаў агульнай плошчай 14,7 гектара. Яны размешчаны ў населеных пунктах Урыцкае, Бабовічы, Даўгалессе, Яроміна, Клімаўка, Новыя Цярэшкавічы і Рудня Марымонава. 3-за таго, што ў мінулым годзе на тэрыторыі раёна былі закрытыя і рэкультываваныя сем міні-палігонаў, нагрузка на тыя, што працуюць, значна ўзрасла. Між тым у бягучым годзе будуць закрыты і рэкультываваныя яшчэ дзве пляцоўкі для складавання адходаў, — адзначыла **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскага райвыканкама Валерыя ШАЦІЛА.**

Наладжванне работы па абыходжанні з адходамі ўскладняецца таксама і таму, што ў Гомельскім раёне адсутнічае буйны палігон для адходаў.

— У выпадку закрыцця ўсіх невялікіх пляцовак вывазіць цвёрдыя камунальныя адходы будуць на палігон «Барацьба» Веткаўскага раёна, размешчаны за 60 кіламетраў ад абласнога цэнтра. Гэта значна павысіць кошт паслугі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі для насельніцтва, — тлумачыць Валерыя Шаціла.

Сёння ў раёне на дзеючых міні-палігонах вядзецца работа па ўшчыльненні адходаў, прыбіранне навакольных участкаў і пад'язных шляхоў. Каб абараніць прылеглую тэрыторыю ад забруджвання, неабходна ахоўнае збудаванне — абвалаўка вышынёй не менш за тры метры. Гэтыя работы будуць выкананы на ўсіх міні-палігонах.

Дарэчы, сёлета на Гомельшчыне ў цэлым плануюць рэкультываваць 25 міні-палігонаў для цвёрдых камунальных адходаў. Летась было закрыта 47. Ужо ў 12 раёнах міні-палігонаў няма наогул. І ўсё ж поўнае спыненне іх эксплуатацыі патрабуе больш высокага ўзроўню арганізацыі збору адходаў ад насельніцтва, у тым ліку і ў сельскай мясцовасці. Да гэтага часу ў некаторых раёнах застаецца нізкім узровень развіцця інфраструктуры для збору адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў. За мінулы год, напрыклад, тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды выявілі амаль 4,5 тысячы фактаў размяшчэння адходаў у несанкцыянаваных месцах, да адказнасці было прыцягнута каля 400 чалавек.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

### У тэму

На тэрыторыі Гомельскага раёна паспяхова працуе тэхналагічная лінія сартавання другасных матэрыяльных рэсурсаў, што адкрыта ў аграгарадку Яроміна. Сюды паступаюць адходы з пластыку, паперы і шкла. За змену работнікі вытворчасці сартуюць у сярэднім да трох тон адходаў з розных населеных пунктаў Гомельскага раёна.

З уводам лініі ў эксплуатацыю ўдалося не толькі вырашыць праблему збору і сартавання другасных матэрыяльных рэсурсаў, але і атрымаць даход ад здачы другаснай сыравіны перапрацоўчым прадпрыемствам.